да новых умоў. Таму ствараюцца бібліятэкі галіновай і жанравай спецыялізацыі (краязнаўчыя, нацыянальныя, тэатральныя, бібліятэкі фантастыкі і прыгодніцкай літаратуры); бібліятэкі па тыпах і відах выданняў (перыёдыкі, нотна-музычныя, бібліятэкі-артатэкі, бібліятэкі-відэатэкі і інш.); бібліятэкі функцыянальнай спецыялізацыі (бібліятэка-клуб; бібліятэка-музей, бібліятэка сямейнага чытання, бібліятэка-дыскатэка).

Апошнія знайшлі найбольшае распаўсюджанне на Уздзеншчыне, Асіпоўшчыне у гарадах Віцебску, Бабруйску, Гродне.

Асаблівасці работы спецыялізаваных бібліятэк з пэўным кантынгентам іх карыстальнікаў разглядаюцца ў лекцыйным матэрыяле спецкурса.

Можна адзначыць, што студэнты з задавальненнем распрацоўваюць планы і праграмы работы розных чытацкіх аматарскіх аб'яднанняў, літаратурна-музычныя кампазіцыі, сцэнарыі, паспяхова апрабуюць гэтыя матэрыялы на практычных занятках у бібліятэках. Тут праяўляюцца веданне матэрыялу, творчыя здольнасці, талент і іншыя асабістыя якасці студэнта.

З кожным годам, улічваючы рэаліі часу, курс удакладняецца і ўдасканальваецца.

З набыццём інстытутам універсітэцкага статуса магчыма інтэграцыя выкладання разглядаемага курса бібліятэказнаўцамі сумесна з прадстаўнікамі духавенства, псіхолагамі і сацыёлагамі, рэжысёрамі, а магчыма вылучыць на распрацаванай тэарэтычнай і фактаграфічнай аснове прафілюючыя курсы па падрыхтоўцы бібліятэкараў па абслугоўванню інвалідаў, веруючых, бібліятэкараў-арганізатараў масавых свят і інш.

Паўлава С.А.,
канд.філал.навук,
дацэнт

## БІБЛІЯТЭЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ: ПРАБЛЕМЫ ЎДАСКАНАЛЕННЯ КУРСА

Курс "Абслугоўванне чытачоў" прадугледжвае вывучэнне студэнтамі тэарэтычных праблем, а таксама фарміраванне практычных уменняў і навыкаў.

Шляхі ўдасканалення "Абслугоўвання чытачоў" як навуковай дысцыпліны ў асноўным супадаюць з агульнымі перспектывамі развіцця навукі ў сучасным свеце.

Значныя рэзервы паглыблення матэрыялу курса звязаны з інтэграцыйнымі тэндэнцыямі: уключэнне ў яго даных педагогікі, псіхалогіі, сацыялогіі, інфарматыкі і шэрагу іншых сумежных дысцыплін. Матэрыялы гэтых навук выкарыстоўваюцца не механічна, а творча, яны арганічна, як элементы працэсу бібліятэчнага абслугоўвання, уваходзяць у структуру курса.

Назапашванне ведаў у сферы абслугоўвання чытачоў дае магчымасць дыферэнцыяцыі курса, больш паглыбленага разглядання асобных праблем. Зараз у межах спецкурсаў паглыблена разглядаюцца асобныя бакі працэсу бібліятэчнага абслугоўвання: "Бібліятэчныя зносіны", "Бібліятэка і вольны час".

Што датычыцца асноўнага курса, то ён павінен мець кумулятыўны характар, быць агульным для студэнтаў усіх спецыялізацый. Нельга пагадзіцца з існуючым размежаваннем курса па кафедрах: "Бібліятэчнае абслугоўванне" -- кафедра бібліятэказнаўства, "Бібліяграфічнае абслугоўванне" і "Інфармацыйнае абслугоўванне" -- кафедра бібліяграфіі і дакументазнаўства. Усе гэтыя працэсы ажыццяўляюцца ў рамках і па законах бібліятэчнага абслугоўвання. У публічных бібліятэках яны ажыццяўляюцца бібліятэкарамі аддзела абслугоўвання.

Інтэграцыя і дыферэнцыяцыя -- значныя рэзервы ўдасканалення курса. Але ж галоўнай умовай павышэння эфектыўнасці яго выкладання з'яўляецца пастаяннае абнаўленне зместу, выяўленне і абагульненне перадавога вопыту абслугоўвання чытачоў у бібліятэках. У гэтым плане прадметная камісія мае цесныя кантакты з работнікамі аддзелаў абслугоўвання: у бібліятэках праводзіцца частка заняткаў (практычных і лабараторных) па індывідуальнаму і масаваму абслугоўванню. У прыватнасці, па масаваму абслугоўванню праводзяцца эксперыментальныя мерапрыемствы з мэтай праверкі эфектыўнасці форм і метадаў работы з рознымі групамі чытачоў, а таксама зместу работы бібліятэк у здзяйсненні нацыянальнай праграмы "Адраджэнне".

Таксама лічым удасканаленнем прафесійнага навучання бібліятэкараў выбраны намі напрамак -- узмацненне псіхалагічнай падрыхтоўкі і набыццё ведаў, навыкаў, зыходзячы з задач практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выкладанні курса выкарыстоўваюцца ў большасці сваёй актуальныя метады навучання, маюцца на ўвазе ролевыя і дзелавыя гульні, аналіз канкрэтных сітуацый. Выкарыстанне элементаў ролевых і дзелавых гульняў асабліва важна пры вывучэнні пытанняў псіхалогіі бібліятэкара і псіхалогіі зносін бібліятэкара з чытачом.

Для аналізу сітуацый зносін выкарыстоўваюцца матэрыялы кантрольных работ студэнтаў-завочнікаў.

Распрацавана методыка аналізу канкрэтных сітуацый, якая дапамагае выявіць: 1) сутнасць канфлікту, паводзіны бібліятэкара і чытача; 2) прычыны ўзнікнення канфлікту (сацыяльныя, псіхалагічныя, матэрыяльныя, бытавыя і інш.); 3) шляхі вырашэння канфлікту, аптымальныя варыянты рашэння. Пры аналізе крытычных рабочых сітуацый студэнты выконваюць ролі і бібліятэкара, і чытача. Для замацавання атрыманых ведаў распрацавана гульня "Бібліятэкар аддзела абслугоўвання".

Пашырэнне практыкі работы бібліятэк у плане арганізацыі вольнага часу, увогуле ўзбагачэння духоўнага патэнцыялу насельніцтва ставіць перад выкладчыкамі задачы фарміравання ў студэнтаў прафесійных уменняў сцэнарна-рэжысёрскага выканання тэмы пасяджэння клуба, вечара кнігі і г.д.

Некаторыя магчымасці паглыблення падрыхтоўкі студэнтаў па пытаннях методыкі арганізацыі масавых мерапрыемстваў ёсць у межах гадзін, адведзеных праграмаю (але ж лічым мэтазгодным увесці спецкурс, які б вялі выкладчыкі дысцыпліны "Абслугоўванне чытачоў" разам з педагогамі мастацкіх спецыялізацый).

Для прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў важнае значэнне мае авалоданне імі крытычна-аналітычнымі метадамі. Тут асаблівую ўвагу звяртаем на дыспут, дыскусію, якія дазваляюць развіць міжасабовыя зносіны паміж чытачамі. На практычных занятках у працэсе падрыхтоўкі дыспута выкарыстоўваем элементы дзелавой гульні.

Працэс набыцця студэнтамі ўменняў і навыкаў абслугоўвання чытачоў знаходзіць натуральны працяг і развіццё ў вытворчай практыцы. Кіраванне працэсам навучання прадугледжвае пераемнасць мэт і задач лабараторна-практычных заняткаў і вытворчай практыкі.

Завяршальным этапам вывучэння дысцыпліны з'яўляецца падрыхтоўка і правядзенне кожнай вучэбнай групай масавага мерапрыемства. На працягу навучальнага года іх праводзіцца па 6--7 і ва універсітэце,і ў бібліятэках-базах.

Клімянкова Н.У.,
канд.пед.навук,
дацэнт
Паўлава С.А.,
канд.філал.навук,
дацэнт

## ПРАБЛЕМАТЫКА КУРСА "АБСЛУГОЎВАННЕ ЧЫТАЧОЎ"

Уся сукупнасць дысцыплін, што вывучаюцца ва універсітэце і складаюць аснову навуковых ведаў, факусіруецца, на наш погляд, у адным з асноўных спецыяльных курсаў -- "Абслугоўванне чытачоў". Менавіта ў абслугоўванні праяўляюцца ўсе галоўныя сацыяльныя функцыі бібліятэкі, менавіта ў абслугоўванні бібліятэкару неабходны ўвесь комплекс агульнаадукацыйных і спецыяльных ведаў, высокая чытацкая культура і камунікатыўная кампетэнтнасць. У выкладанні названай дысцыпліны склалася шмат традыцый і з'явілася шмат навацый. Але якасць падрыхтоўкі бібліятэкара для абслугоўвання чытачоў пераважна залежыць ад агульнага ўзроўню выкладання ва універсітэце як агульнаадукацыйных, так і спецыяльных дысцыплін. На сённяшні дзень мы асабліва востра адчуваем адсутнасць адзінства пазіцый у падыходах да навучання студэнтаў.

У гэтай сувязі нам уяўляецца перспектыўным ужыванне метадалогіі сістэмна-дзейнаснага падыходу і вызначэнне на дадзенай падставе паняццяў аб'екта і прадмета бібліятэчнай і бібліяграфічнай дзейнасці.

Як вядома, у бібліятэчнай справе існуе сістэма знешняга аб'екта "дакумент -- спажывец", альбо "кніга -- чытач". Кніга застаецца галоўнай, найбольш распаўсюджанай формай дакумента, але з улікам існавання новых носьбітаў інфармацыі больш дакладнай уяўляецца першая фармулёўка.Чытач, альбо спажывец, які мае патрэбу ў дакументальна фіксаванай інфармацыі, займае вядучае месца ў сістэме. Ён з'яўляецца жывым носьбітам неабходных і выпадко-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ